Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_____________Ю. П. Бондар
«____»___________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ /вуч.

# ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНАМАСТАЦТВА

*Вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

Мінск
БДУКМ
2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. М. Шаройка,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*М. А. Белаокая,* навуковы супрацоўнік аддзела экранных мастацтваў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства;
*У. Д. Персідская*, загадчык кафедры рэжысуры эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», старшы выкладчык, кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 14 ад 20.05.2015);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 18.06.2015)

Адказны за рэдакцыю: *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск: *А. М. Шаройка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Дакументальнае кінамастацтва» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь адпаведна патрабаванням адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках).

У праграме прадстаўлены матэрыял, які раскрывае важныя вехі развіцця гісторыі тэлебачання. Дадзеная праграма з’яўляецца адной з вучэбных дысцыплін, накіраваных на ўдасканаленне тэарэтычных ведаў у галіне экраннага мастацтва. Праграма ўзаемазвязана з наступнымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Гісторыя мастацтваў», «Мастацтва ХХ ст. Фотамастацтва», «Мастацтва ХХ ст. Кінамастацтва», «Мастацтва ХХ ст. Экранная культура». Унутранай сувяззю паміж гэтымі дысцыплінамі з’яўляецца вывучэнне праблем сусветнага кінамастацтва, кантэкстуальных сувязей паміж нацыянальнымі кінематаграфіямі.

Засваенне адукацыйнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Дакументальнае кінамастацтва» павінна забяспечыць фарміраванне наступных *акадэмічных кампетэнцый:*

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем.

АК-12. Прадстаўляць сучасную карціну свету на аснове цэласнай сістэмы гуманітарных ведаў, арыентавацца ў каштоўнасцях быцця, жыцця, культуры.

АК-14. Разумець і аналізаваць светапоглядныя, сацыяльна і асобасна-значныя філасофскія праблемы.

Таксама студэнт павінен набыць наступныя *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*:

САК-1. Усведамляць грамадзянскі абавязак, валодаць развітым пачуццём патрыятызму, ведаць правы і выконваць абавязкі грамадзяніна.

САК-8. Паважліва і асцярожна ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

Пасля вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Дакументальнае кінамастацтва» студэнт павінен валодаць наступнымі *прафесійнымі кампетэнцыямі* і быць здольным:

ПК-1. Кваліфікавана праводзіць навуковыя даследаванні па выяўленні, апісанні, аналізе, рэцэнзаванні твораў мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-10. Дыялектычна думаць і аргументаваць свой пункт гледжання, аналізаваць факты і прагназаваць развіццё падзей.

ПК-20. Распрацоўваць арыгінальныя па ідэйна-мастацкай задуме і выкананні творы.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – засваенне дакладных ведаў аб асноўных заканамернасцях і тэндэнцыях гістарычнага развіцця сусветнага і айчыннага дакументальнага кінамастацтва, яго асобных перыядаў.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– сфарміраваць паглыбленыя веды аб спецыфічных рысах дакументальнага кінамастацтва, вызначыць гістарычныя вектары яго развіцця;

– даць уяўленне аб агульным і адметным у экраннай (мастацкай) інтэрпрэтацыі рэчаіснасці на нацыянальна-культурным, жанрава-відавым і індывідуальна-аўтарскім узроўнях;

– пазнаёміць з асноўнымі дасягненнямі і шэдэўрамі сусветнага і айчыннага дакументальнага кінамастацтва.

У выніку вывучэння матэрыялу студэнты павінны *ведаць:*

– гісторыка-тэарэтычныя асновы мастацтва;

– спецыфіку вобразнасці мастацкага тэксту;

– асноўныя гістарычныя факты, падзеі, даты, імёны дзеячаў кінамастацтва;

– відавую і жанравую класіфікацыю розных відаў мастацтваў;

– стылі, напрамкі, плыні ў мастацтве;

– спецыфіку мастацкай вобразнасці дакументальнага кіно;

– жанравыя, відавыя і стылявыя ўтварэнні дакументальнага кіно;

– асноўныя артэфакты, падзеі, імёны буйных прадстаўнікоў дакументальнага кіно;

*умець:*

– выяўляць сутнасць мастацкага твора з дапамогай выкарыстання розных тэарэтычных прынцыпаў і метадаў;

– характарызаваць семіятычную і сімвалічную вобразнасць твораў мастацтва;

– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць аўтара;

– вызначаць спецыфіку вобразнай мовы твораў мастацтва;

– выяўляць эпахальныя, нацыянальна-культурныя і індывідуальна-аўтарскія здабыткі, актуальныя ў галіне дакументальнага кінамастацтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначаць жанравую спецыфіку ўзаемадачыненняў з традыцыйнымі відамі мастацтва;

– характарызаваць дынаміку і этапы эвалюцыі дакументальнага кіно ў кантэксце агульнага развіцця экраннага мастацтва;

*валодаць:*

– метадалогіяй даследавання дакументальнага кінамастацтва;

– методыкай цэласнага і кампаратыўнага аналізу дакументальнага фільма з улікам жанравай, стылявой і семантычнай спецыфікі.

Выкладанне дысцыпліны «Дакументальнае кінамастацтва» мэтазгодна ажыццяўляць у форме лекцыйных і семінарскіх заняткаў. Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адказваюць мэтам вывучэння дадзенай дысцыпліны, з'яўляюцца праблемнае навучанне (даследчыя метады) і камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, праблемныя дэбаты, круглы стол і інш.).

Заняткі суправаджаюцца аўдыявізуальнымі і мультымедыйнымі дэманстрацыямі, слайд-прэзентацыямі для ўзмацнення эмацыянальна-вобразнага ўспрымання матэрыялу курса.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дакументальнае кінамастацтва» ўсяго прадугледжана 78 гадзін, з якіх 50 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 28 гадзін, семінары – 22 гадзіны. Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | - |
| **Раздзел I. Станаўленне дакументальнага кіно: нямы перыяд (1895–1920-я гг.)** | | | |
| *Тэма 1.* Зараджэнне дакументальнага кіно ў Заходняй Еўропе | 2 | 2 | - |
| *Тэма 2.* Дакументальнае кіно ў дарэвалюцыйнай Расіі | 2 | 2 | - |
| *Тэма 3.* Еўрапейскае і амерыканскае кіно 1920-х гг. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Савецкая кінадакументалістыка 1920-х гг. | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел II. Кінадакументалістыка эпохі таталітарнага кіно (1930–1945-я гг.)** | | | |
| *Тэма 5.* Еўрапейскае і амерыканскае дакументальнае кіно 1930-х гг. | 2 | 2 | - |
| *Тэма 6.* Дакументалістыка часоў Другой сусветнай вайны | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Савецкая дакументалістыка часоў Вялікай Айчыннай вайны | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел III. Кінадакументалістыка 1950–1990-х гг.** | | | |
| *Тэма 8.* Еўрапейскае і амерыканскае дакументальнае кіно 1950–1990-х гг. | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 9.* Савецкая экранная дакументалістыка кіно і тэлебачання 1950-х – 1991 гг. | 6 | 2 | 4 |
| **Раздзел IV. Кінадакументалістыка 1990–2000-х гг.** | | | |
| *Тэма 10.* Сусветнае дакументальнае кіно | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 11.* Постсавецкае дакументальнае кіно | 8 | 4 | 4 |
| **Разам…** | **50** | **28** | **22** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Дакументальнае кіно як від кінамастацтва. Месца кінадакументалістыкі ў сучаснай сістэме сродкаў масавай інфармацыі, экраннай культуры. Структура вобраза ў дакументальным творы. Дакументаліст і жыццёвы матэрыял. Праблема, дакладнасць і вобраз. Фарміраванне і развіццё кінатэорыі ў працах Л. Куляшова, Д. Вертава, С. Эйзенштэйна, У. Пудоўкіна, В. Шклоўскага, Ю. Тынянава і інш. Прыцыпы перыядызацыі і асноўныя перыяды развіцця сусветнага дакументальнага кінамастацтва. Творчыя кірункі і мастацкія плыні ў развіцці сусветнага і айчыннага дакументальнага кінамастацтва. Праблема традыцый і навацый.

## Раздзел I. Станаўленне дакументальнага кіно: нямы перыяд (1895–1920-я гг.)

### *Тэма 1. Зараджэнне дакументальнага кіно ў Заходняй Еўропе*

Першыя дакументальныя здымкі (1895). Вынаходнікі кіно браты Л. і А. Люмьер. Ідэалогія першых фільмаў як «ажыўшая фатаграфія». Эфект прысутнасці, магчымасць для гледача ўласнымі вачыма ўбачыць падзеі, непасрэдным сведкай якіх глядач мог і не быць. Нараджэнне жанру кінарэпартажу, яго мэта і задачы. Неарганізаваная, ненакіраваная выява рэпартажнага здымка, рассеянасць інфармацыі як асноўная якасць рэпартажнай выявы. Мастацкі рэпартаж, яго магчымасці. Нараджэнне рэпартажнай хронікі. Вялікі сэнс рэпартажнай хронікі ў гады Першай сусветнай вайны. Патрабаванні да апаратараў умела адлюстроўваць падзею і пранікаць у яе сацыяльную сутнасць. Шавінісцкая прапаганда тых гадоў, імкненне апраўдаць імперыялістычную вайну (1914–1917).

### *Тэма 2. Дакументальнае кіно ў дарэвалюцыйнай Расіі*

Першыя хранікальна-дакументальныя здымкі і фільмы як пачатак стварэння кінахронікі і пераўтварэнне дакументальнага кіно ў сродак масавай візуальнай інфармацыі. Экспансія французскіх і іншых замежных фірм на расійскім кінарынку. Першыя дакументальныя здымкі ў Расіі, іх асноўная тэматыка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(ваенныя парады, урачыстыя выхады царуючых асоб, пажары, стыхійныя бедствы, этнаграфічныя і экзатычныя відавыя здымкі). Нараджэнне кананічных форм кароткаметражнага фільма і кіначасопіса (1900–1910). Здымкі аператара А. Дранкова ў Яснай Паляне Л.Талстога.

*Тэма 3. Еўрапейскае і амерыканскае кіно 1920-х гг.*

Дакументальны кірунак у нямым пярыядзе сусветнага кіно: французскі «авангард», нямецкае эксперыментальнае кіно, развіццё хранікальнага і экспедыцыйнага кіно. Паняцце фотагенія як лозунг барацьбы за аднаўленне кіно (Л. Дэлюк). Непасрэдны кантакт з сучаснай рэальнасцю, пашырэнне і паглыбленне погляду на свет, узбагачэнне кінамовы, эксперыменты ў галіне абстрактнага фільма ў нямецкім нямым кіно.

Паэтычны свет фільмаў амерыканскага кінематографіста Р. Флаэрці. Экспедыцыйнае кіно, фільмы-назіранні. «Нанук з Поўначы» (1922), «Маана паўднёвых мораў» (1926), «Чалавек з Арана» (1934). Асноўная тэма фільмаў Р. Флаэрці – барацьба чалавека са стыхіяй, з сіламі прыроды.

*Тэма 4. Савецкая кінадакументалістыка 1920-х гг.*

Першыя крокі савецкай дзяржаўнай кінахронікі. Агітацыйна-прапагандысцкія і культурна-асветніцкія дакументальныя фільмы першых пасляваенных гадоў (1917–1922). Інфармацыйная хроніка першых гадоў рэвалюцыі. Унёсак у дакументальны кінематограф тых гадоў Р. Балцянскага, У. Гардзіна, Л. Куляшова. Перыядычны экранны часопіс «Кінатыдзень». Зліццё інфармацыі, закладзенай у тых ці іншых фактах, з іх мастацкай вобразнай інтэрпрэтацыяй. Роля М. Кальцова і Д. Вертава. Значэнне кінахронікі ў экранным засваенні новага жыццёвага матэрыялу. Гісторыка-рэвалюцыйная публіцыстыка Э. Шуб («Падзенне дынастыі Раманавых» (1927), «Расія Мікалая II і Леў Талстой» (1928), «Вялікі шлях» (1927).

Дзіга Вертаў (1897–1954). Вядучая роля Д. Вертава ў стварэнні расійскага дакументальнага кіно. Праца ў хроніцы. Часопісы «Кінатыдзень», «Кінапраўда». Маніфест «Кінокі. Пераварот» (1923). Публіцыстычныя фільмы Д. Вертава «Кінавока» (1924), «Ленінская кінапраўда» (1925), «Кроч, Савет!» (1926), «Шостая частка свету» (1926). Асаблівасці творчага метаду. Прынцыпы «кінавока», «кінапраўда», «жыццё незнарок», скрытая камера, тэорыя інтэрвалаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Кінадакументалістыка эпохі таталітарнага кіно (1930–1940-я гг.)

### *Тэма 5. Еўрапейскае і амерыканскае дакументальнае кіно 1930-х гг.*

Школа Дж. Грырсана і амерыканскае дакументальнае кіно 1930-х гг. Фільм як творчая інтэрпрэтацыя сучаснай рэчаіснасці. «Рыбацкія судны» (1929), «Індустрыяльная Брытанія» (1933), «Начная пошта» (1936). Аб'яднанне «Crown».

Творчасць Ё. Івенса, яго ўнёсак у сусветнае кінамастацтва. «Мост» (1928), «Дождж» (1929). Публіцыстычныя і экспедыцыйныя фільмы рэжысёра: «Песня пра герояў» (1932), «Барынаж» (1933), «Іспанская зямля» (1937).

### *Тэма 6. Дакументалістыка часоў Другой сусветнай вайны*

Барацьба з фашызмам. Прыход рэжысёраў-ігравікоў у дакументальнае кіно (Ф. Капра, Л. Майлстоўн, Дж. Форд і інш.). Здымкі прапагандысцкіх фільмаў. Мантажны фільм. Своеасаблівасці хранікальнага рэпартажу ваенных часоў.

### *Тэма 7. Савецкая дакументалістыка часоў Вялікай Айчыннай вайны*

Развіццё дакументалістыкі ў 1930–1940-я гг. Кіно як інструмент прапаганды і асветы. Міфатворчасць савецкай і нямецкай хронікі 1930-х і пачатку 1940-х гг. М. Каўфман, І. Капалін «Вясной» (1929), «Масква» (1927), Л. Рыфеншталь і яе фільм «Трыумф волі» (1934).

Дакументальны фільм-памфлет. Заснавальнік гэтага жанру А. Мядведкін, яго жыццё і творчасць. Праца кінацягніка ў гады першай пяцігодкі. Уплыў творчасці і дзейнасці А. Мядведкіна на сусветны кінапрацэс.

Подзвіг савецкіх дакументалістаў у гады Другой сусветнай вайны. Праслаўленне доблесці савецкага чалавека, выкрыццё бесчалавечнасці фашызму, праўдзівы аповед пра падзеі вайны. Франтавая хроніка, баявыя кіназборнікі, поўнаметражныя дакументальныя фільмы. «Разгром нямецкіх войск пад Масквой» (1942, Л. Варламаў, І. Капалін), «Берлін» (1945, Ю. Райзман), «Бітва за нашу Савецкую Украіну» (1943, А. Даўжэнка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Кінадакументалістыка 1950–1990-х гг.

*Тэма 8. Еўрапейскае і амерыканскае дакументальнае кіно 1950–1990-х гг.*

Паняцці «сінема-верытэ» і «праўдзівае кіно». Імкненне да фіксацыі патоку бягучых падзей. Здымкі без адбору матэрыялу, без сцэнарыя і дубляў. Выкарыстанне сучаснай кінатэхнікі, партатыўных мікрафонаў і г. д. Прагрэсіўная кінапубліцыстыка. Адбор матэрыялу з мэтай раскрыцця пазіцыі аўтара. «Незвычайная Амерыка» («Амерыка вачамі француза») Ф. Рэйшэнбаха, «Памерці ў Мадрыдзе» (Ф. Росіф), «Цудоўны май» (К. Маркер).

Адкрыцці «групы 30-ці» і «сінема-верытэ» ў Францыі, англійскае «свабоднае кіно» і новае амерыканскае кіно. Заслугі гэтых тэорый і кірункі ў даследаванні жыцця ўнутранага света чалавека. «Дзеці чацвярга» (Л. Андэрсан), «Матулечка не дазваляе» (К. Рэйс, Т. Рычардсан), «Хроніка аднаго лета» (Ж. Руш), «Ноч і туман» (А. Рэнэ).

Адкрыццё новых магчымасцей дакументальнага кіно ў творчасці А. і А. Торндайк, мантаж гістарычнай хронікі і сучаснага рэпартажу. «Тэўтонскі меч» (1958), «Рускі цуд» (1963).

*Тэма 9. Савецкая экранная дакументалістыка кіно і тэлебачання 1950-х – 1991 гг.*

На шляху да даследавання асобы чалавека: дакументальнае кіно і тэлебачанне 1950-х гг. Даследаванне глыбінных жыццёвых працэсаў. Адыход ад простага інфармацыйнага пералічэння. Спосабы і сродкі пранікнення ў характары людзей і сацыяльную сферу, якая іх акружае. «Аповесць пра нафтавікоў Каспія» (1953 г., Р. Кармэн), «Незабыўныя сустрэчы» (1959 г., А. Аванесаў).

Залатая пара шасцідзясятнікаў у савецкай дакументалістыцы. Сацыяльны кантэкст, «новая дакладнасць», змяненні сістэмы кінаназірання, новыя прыёмы правакацыі, сінхроннай спавядальнасці. «Людзі блакітнага агню» (1961 г., Р. Грыгор’еў), «Галасы цаліны» (1961 г., Л. Дзербышаў). Спалучэнне факта з асабовым, аўтарскім успрыманнем, з сацыяльным аналізам рэчаіснасці. Фільмы Г. Астаніна, Р. Кармэна, І. Капаліна, Л. Крысці, Я. Учыцеля, Б. Галантэра, Л. Гурэвіча, І. Герштэйна. Фільм В. Лісаковіча «Кацюша» (1964).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філасофскі дакументальны фільм і яго заслугі ў даследаванні глыбінных агульначалавечых праблем. Ідэалагічны падыход да вырашэння творчых і філасофскіх задач. «Сабачае жыццё», «Мітуслівы свет» – пэўны этап у развіцці гэтага жанру. Вялікі дакументальны фільм М. Рома. «Незвычайны фашызм» і яго ўплыў на далейшы кінематаграфічны працэс.

Новыя выразныя сродкі, новыя спецыяльныя функцыі экраннай дакументалістыкі кіно і тэлебачання ў 1970–1990 гг. Разнастайнасць школ кінематаграфістаў Расіі (Масква, Санкт-Пецярбург, Екацярынбург, Новасібірск).

Новасібірская школа дакументальнага кіно 1960–1990-х гг. Разнастайнасць тэм і падыходаў да творчых задач, адзіны погляд на прыроду дакументальнага кіно і разнастайнасць творчых почыркаў. Фільмы рэжысёраў Я. Саломіна, Ю. Шылера, Ю. Малашына, В. Гонава, Л. Сікарука, Р. Ерназаравай.

## Раздзел IV. Кінадакументалістыка 1990–2000-х гг.

### *Тэма 10. Сусветнае дакументальнае кіно*

Актуальныя праблемы вытворчасці і развіцця дакументальнага кіно і тэлебачання. Стагнацыя кінадакументалістыкі. Тэматычныя кірункі, жанравыя перавагі. Фестывальнае жыццё.

### *Тэма 11. Постсавецкае дакументальнае кіно*

«Перабудова» кінавытворчасці. З'яўленне вялікай колькасці незалежных кінастудый. Актуальныя праблемы вытворчасці і развіцця дакументальнага кіно і тэлебачання. Тэматычныя кірункі, жанравыя перавагі. Фестывальнае жыццё.

Беларуская кінадакументалістыка. Вядучыя кінастудыі. Праблемы вытворчасці. Асноўныя тэматычныя кірункі. Жанравы дыяпазон. Творчасць В. Аслюка, Г. Адамовіч, В. Алая, І. Бышнёва, В. Жыгалкі, В. Шавялевіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Дробашенко, С. В.* История советского документального кино : учеб.-метод. пособие / С. В. Дробашенко. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1980. – 90 с.

*2. Мартыненко, Ю. Я.* Введение в теорию документального кино: учеб. пособие / Ю. Я. Мартыненко ; ВГИК, каф. киноведения. – М. : Б.и., 1973. – 112 с.

*3. Мартыненко, Ю. Я.* Документальное киноискусство / Ю. Я. Мартыненко. – М. : Знание, 1979. – 112 с. – (Нар. ун-т, фак. лит. и искусства).

*4.* После взрыва : док. кино 90-х : сб. ст. / Науч.-исслед. ин-т киноискусства ; сост.: Г. Е. Долматовская, Г. И. Копалина. – М. : Андреев. флаг, 1995. – 224 с.

*Дадатковая*

*1.* Белорусское кино : персоналии : 80-летию белорус. кино и 60-летию Великой Победы посвящается / Нац. киностудия «Беларусьфільм», Белорус. союз кинематографистов, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора НАН Беларуси ; авт. концепции, сост. и науч. ред. О. Нечай. – Минск : Ковчег, 2007. – 403 с.

*2. Дзига Вертов.* Статьи. Дневники. Замыслы : сб. / ред.-сост., авт. вступ. ст. и примеч. С. В. Дробашенко. – М. : Искусство, 1966. – 320 с.

*3.* Взрыв: Бытие и быт документального кино в конце восьмидесятых / сост.: Г. Долматовская, Г. Копалина. – М. : ВНИИК, 1991. – 179 с.

*4.* Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2004. – 4 т.

*5. Джулай, Л. Н.* Документальный иллюзион : отечественный кинодокументализм – опыты социального творчества / Л. Н. Джулай ; М-во культуры Рос. Федерации, Науч.-исслед. ин-т киноискусства. – М. : Материк, 2001. – 243 с.

*6.* Документальное кино эпохи реформаторства : сб. ст. / НИИ киноискусства, М-во культуры Рос. Федерации ; сост.: Г. Долматовская, Г. Копалина. – М. : Материк, 2001. – 159 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7.* Документальный видеофильм: Этап становления: сб. ст. / Гос. ком. СССР по телевидению и радиовещанию, Центр науч. программирования; сост. С. А. Белянинов [и др.]. – М. : Искусство, 1982. – 127 с.

*8. Дробашенко, С. В.* Пространство экранного документа [Эстетика документализма] / С. В. Дробашенко. – М. : Искусство, 1986. – 320 с.

*9. Зак, В. Г.* Михаил Ромм и его фильмы / В. Г. Зак. – М. : Искусство, 1988. – 305 с.

*10. Красинский, А. В.* Кино: игровое плюс документальное / А. В. Красинский ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора АН БССР. – Минск : Наука и техника, 1987. – 120 с.

*11.* Неигровое кино: теоретические и практические проблемы режиссуры: сб. ст. / Всерос. гос. ин-т кинематографии им. С. А. Герасимова, каф. неигрового кино- и телефильма ; отв. ред. О. С. Горностаева. – М. : ВГИК, 1992. – 123 с.

*12. Огнев, К. К.* Антифашистская тема в документальном кино / К. К. Огнев. – М. : Знание, 1985. – 48 с. – (Новое в жизни, науке, технике. Сер. «Искусство», № 3).

*13. Рошаль, Л. М.* Эффект скрытого изображения: факт и автор в неигровом кино / Л. М. Рошаль ; НИИ киноискусства. – М. : Материк, 2001. – 206 с.

*14. Франк, Г.* Карта Птолемея: Записки кинодокументалиста / Г. Франк. – М. : Изд-во Студия Артемия Лебедева, 2009. – 389 с.

*15. Шуб, Э.* Жизнь моя – кинематограф. Крупным планом: Статья, выступления. Неосуществленные замыслы. Переписка / Ин-т истории искусств; сост. А. И. Коноплева ; отв. ред. С. В. Дробашенко. – 2-е изд., доп. – М. : Искусство, 1972. – 472 с.

*16. Юренев, Р. Н.* Александр Медведкин, сатирик / Р. Н. Юренев. – М. : БПСК, 1981. – 72 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для ажыццяўлення кантралюемай самастойнай работы студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, які мае дыдактычны характар і ўжываецца комплексна. У якасці аднаго са сродкаў кантролю і ацэнкі могуць быць выкарыстаны крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным або некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух мностваў з адным або некалькімі суадносінамі і аднолькавай або рознай колькасцю элементаў у мностваў; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці, якія мяркуюць фармалізаваны адказ.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць заданні адкрытай формы са свабодна канструяваным адказам, праблемныя і творчыя задачы, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

Кафедры УВА маюць права вызначаць віды і перыядычнасць ажыццяўлення кантрольна-ацэначнай дзейнасці з улікам структуры зместу вучэбнай дысцыпліны.

## Рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Мэтай самастойнай работы студэнтаў з'яўляецца стымуляванне пазнавальнай актыўнасці, пераход на прадуктыўны, творчы ўзровень засваення ведаў у развіцці акадэмічных, сацыяльна-асобасных, прафесійных кампетэнцый.

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з палажэннем аб самастойнай працы студэнтаў і ажыццяўляецца ў выглядзе аўдыторных і пазааўдыторных форм. Па дысцыпліне распрацоўваецца вучэбна-метадычны комплекс з матэрыяламі і рэкамендацыямі, якія дапамогуць студэнту ў арганізацыі самастойнай работы. Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем.

Найбольш якаснаму працэсу навучання студэнтаў па названай дысцыпліне павінен садзейнічаць дадатковы прагляд кінематаграфічных твораў. Аўтарам праграмы створана калекцыя відэазапісаў, якая дазваляе больш прадуктыўна асвойваць вывучаемы курс.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНАМАСТАЦТВА**

*Вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства*
*(інтэграванае)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,56. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ